канстатуе: «Тэма скарбаў моцна ўладкавалася ў вуснай народнай творчасці, у творах пісьменнікаў і паэтаў, саступаючы па сваёй папулярнасці толькі тэме кахання».


**ЛІТАРАТУРА**

1. *Рябцевич, В.* Клады: атрибуция, интерпретация, классификации / В. Рябцевич // Банковский вестник. – 2015. – № 8. – С. 54 – 60.


## МАСТАЦКАЕ КАЛЕКЦЫЯНІРАВАННЕ ЭТНАГРАФІЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

**Мастацкае калекцыяніраванне этнаграфічных каштоўнасцей** (ад *лац.* collectio – збіранне, *грэч.* ethnos – племя, народ, і grapho – пішу) – *мэтанакіраванае збіранне прадметаў народнай культуры пэўнага тыпу, якія маюць мастацкую каштоўнасць.* Мастацкае калекцыяніраванне імкліва пашырылася ў эпоху Адраджэння ў сувязі з адкрыццём спецыфічнай каштоўнасці твораў мастацтва, а збор этнаграфічных каштоўнасцей – у сувязі з фарміраваннем еўрапейскіх нацый і іх імкненнем да самавызначэння. Магутным стымулам для складання вядомых этнакалекций сталі Вялікія геаграфічныя адкрыцці, якія пазнаёмілі еўрапейцаў з мастацтвам іншых кантынентаў. Таму з XV – XVII стагоддзяў у Еўропе сталі з'яўляцца грамадскія і прыватныя калекцыі традыцыйных касцюмаў, вышываных тканін, дываноў, абразоў, распісаных вырабаў са шкла, упрыгожванняў і г. д. Сёння калекцыяніраванню этнаграфічных каштоўнасцей цалкам прысвечаны экспазіцыі і зборы шэрагу музеяў: Музей этнамастацтва (Канстанца, Румынія), Усерасійскі музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (Масква), Музей сучаснага народнага і самадзейнага мастацтва (Гродна), Веткаўскі музей стараверства і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава (Ветка) і г. д.


**ЛІТАРАТУРА**

1. *Берштейн, Б.* Пигмалион наизнанку: К истории становления мира искусства / Б. Берштейн. – М. : Языки славянской культуры, 2002. – С. 7 – 14.


## МАСТАЦКАЯ РЭКАНСТРУКЦЫЯ ЭТНАКУЛЬТУРЫ

**Мастацкая рэканструкцыя этнакультуры** – *аднаўленне элементаў аўтэнтычнай традыцыйнай вясковай культуры ва ўмовах урбанізаванага сацыякультурнага працэсу мастацкімі сродкамі на дакументальнай аснове.* Спецыялісты выдзяляюць наступныя этапы мастацкай рэканструкцыі: даследчы, арганізацыйна-метадычны, вучэбна-трэнінгавы, прэзентацыйны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ